дукции каждого предприятия. Более высокой конкурентоспособностью обладает продукция ОАО «Брестский молочный комбинат».

Для повышения конкурентоспособности продукции ОАО «Молоко» нами разработана система маркетинговых мероприятий, состоящая из двух блоков: совершенствование товарной политики; совершенствование маркетинговых коммуникаций. Каждый блок содержит специфические инструменты и методы повышение конкурентоспособности продукции.

Нами обоснован экономический эффект от выведения на рынок новой продукции под товарной маркой «Божья коровка» и проведения рекламной кампании в поддержку этой серии. Экономическим эффектом от проведения этих мероприятий является увеличение объема продаж продукции ОАО «Молоко» на 5663,6 млн. руб., а также повышение рентабельности продукции, более полная загрузка производственных мощностей, повышение узнаваемости товарного знака предприятия и формирование привлекательного имиджа продукции.

© БГЭУ

# ПЕРАДУМОВЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎДЗЕЛУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У МІЖНАРОДНАЙ ВАЛЮТНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

***А. А. ВЯЧЭРСКІ*, А. П. ЛЯЎКОВІЧ**

Monetary integration is one of the main features of the modern globalized economy. The twelve EU countries that now form the Eurozone serve as an outstanding example of a large area with a common currency. A number of countries from Central and Eastern Europe are preparing to join it. The example of Poland demonstrates that a monetary unification with the developed countries is largely beneficial for a transition economy, especially in the long run because it is accompanied with a rise in foreign direct investment, trade creation and decrease of costs and uncertainty at the firm level. The Republic of Belarus can also benefit from monetary unification with one of the main trade partners but this process is to be preceded by large-scale market reforms

Ключавыя словы: міжнародная валютная інтэграцыя, тэорыя аптымальных валютных зон, асіметрычныя шокі, механізмы адаптацыі, макраэканамічная стабільнасць

## 1. Уводзіны

Міжнародная валютная інтэграцыя становіцца часткай працэсаў глабалізацыі і міжнароднай эканамічнай інтэграцыі ў сусветнай гаспадарцы. Развіццё працэсаў эканамічнай інтэграцыі «ўглыб» у апошнія дзесяцігоддзі прывяло да таго, што некаторыя краіны гатовы адмовіцца ад суверэнітэту ў галіне грашова-крэдытнай палітыкі для атрымання пераваг, якія дае адзіная валюта ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве. Найбольш яскравым прыкладам з'яўляецца эканамічны і валютны Саюз (ЭВС) 12 краін ЕС, да якога далучацца ў будучым новыя члены Супольнасці з ліку краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Актуальнасць гэтай тэме дадаюць планы валютнай інтэграцыі ў больш ці менш далёкай перспектыве, якія зараджаюцца ў некаторых іншых групоўках і рэгіёнах, у прыватнасці ў Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), у Лацінскай Амерыцы, у Саюзе Беларусі і Расіі і г. д.

## 2. Тэарэтычныя аспекты міжнароднай валютнай інтэграцыі

Тэндэнцыя міжнароднай валютнай інтэграцыі звязана з тым, што разам з ростам узаемазалежнасці краін свету плаваючы абменны курс часта становіцца менш дзейсным сродкам рэгулявання эканамічнай стабільнасці. Замест таго, каб дазваляць краінам нейтралізаваць небяспечныя знешнія шокі, выкарыстанне валютнага курсу можа выклікаць дадатковую нестабільнасць нацыянальнай эканомікі. Гэта асабліва верна для больш адкрытых малых эканомік, выдаткі якіх на падтрыманне стабільнасці нацыянальнай валюты могуць быць неапраўдана значнымі [1, с. 55].

У аснове абгрунтавання працэсаў валютнай інтэграцыі ляжыць тэорыя аптымальных валютных зон. Яе ўзнікненне звязана з пошукам новай формы сусветнай валютна-фінансавай сістэмы. У якасці альтэрнатывы Брэтан-Вудскаму доларaваму стандарту прапаноўвалася сістэма нацыянальных валют з плаваючымі валютнымі курсамі. Некаторыя эканамісты выказалі думку, што пры пэўных умовах асобным краінам будзе мэтазгодна ўтварыць разам адну валютную зону з плаваючым абменным курсам да трэціх валют [2, с. 62–63].

Дасягнуць мэт унутры- і знешнеэканамічнай стабільнасці у складзе валютнага саюза краінам дапамагаюць новыя механізмы прыстасавання эканомікі да знешніх шокаў, якія ствараюцца замест інструментаў незалежнай грашова-крэдытнай палітыкі. Гэтыя механізмы апісваюцца з дапамогай так званых крытэрыяў аптымальнасці. Адпаведнасць гэтым крытэрыям памяншае рызыку эканамічнай нестабільнасці пасля валютнай інтэграцыі і рызыку ўзнікнення асіметрычных шокаў, якія па-рознаму ўздзейнічаюць на краіны-члены. Як правіла, да гэтых крытэрыяў адносяць высокую мабільнасць ра-

бочай сілы, адкрытасць эканомікі і значную ступень гандлёвай інтэграцыі, дыверсіфікаванасць вытворчасці, высокую ступень падабенства эканамічных структур, гібкасць цэн і заработнай платы, дзейснасць механізму фіскальнага федэралізму і інтэграцыю фінансавых рынкаў.

Класічная тэорыя аптымальных валютных зон засяроджвае сваю ўвагу на выдатках валютнай інтэграцыі і механізмах, якія дазваляюць іх пазбегнуць. Аднак не меншая ўвага павінна быць нададзена перавагам, якія нясе з сабою валютная інтэграцыя. Існуе дзве асноўныя крыніцы пераваг ад валютнай інтэграцыі: скасаванне трансакцыйных выдаткаў, звязаных з коштам абмену валют, і ліквідацыя рызыкі ўзрушэнняў валютнага курсу.

У той час як эфект ад ліквідацыі трансакцыйных выдаткаў мае хутчэй аднаразовы характар, ліквідацыя рызыкі нечаканых узрушэнняў валютнага курсу ў выніку ўвядзення адзінай валюты стварае перавагі для краін-членаў у доўгатэрміновай перспектыве. Па-першае, ліквідацыя валютнай рызыкі стымулюе інвестыцыйныя працэсы ў рэгіёне. Па-другое, увядзенне адзінай валюты, на думку многіх эканамістаў, прыводзіць з цягам часу да істотнага росту ўзаемнага гандлю краін-членаў.

Трэба ўлічваць, што рост гандлю выклікае дадатковыя станоўчыя эфекты для эканомікі ў доўгатэрміновым перыядзе. Сярод гэтых эфектаў новая тэорыя гандлю вылучае дадатковае назапашванне ведаў і большую інтэнсіўнасць абмену тэхналогіямі, што адбываецца дзякуючы росту колькасці кантактаў паміж партнёрамі з розных краін пры росце гандлю паміж імі. У рэшце рэшт гэтыя фактары спрыяюць эканамічнаму росту ў краіне і перамяшчаюць нацыянальную эканоміку на больш высокую траекторыю росту [1, с. 68–73].

Прыняцце асобнай краінай рашэння аб уступленні ў валютны саюз робіцца на падставе параўнальнага аналізу плюсаў і мінусаў ад увядзення адзінай валюты. Выйгрыш ў эканамічнай эфектыўнасці параўноўваецца з выдаткамі, якія вынікаюць з магчымай большай макраэканамічнай і знешнеэканамічнай нестабільнасці.

### 3. Выдаткі і перавагі далучэння да валютнай зоны на прыкладзе Польшчы

Аналізуючы сусветны вопыт валютнай інтэграцыі, трэба адзначыць, што найбольшага поспеху ў гэтай галіне дасягнуў Еўрапейскі Саюз, дзе ў 12 краінах ужо не першы год функцыянуе адзіная валюта еўра. Да іх з цягам часу далучацца іншыя, у прыватнасці з ліку новых членаў. Падрыхтоўка гэтых краін да ўвядзення адзінай валюты, дыскусія аб магчымых выдатках і перавагах гэтага працэсу з'яўляюцца важнымі для тых краін, якія таксама плануюць адмовіцца ад уласнай грашовай адзінкі. Асабліва карысным гэты вопыт з'яўляецца для пераходных эканомік, якія характарызуюцца падобнымі да краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы структурнымі і інстытуцыйнымі характарыстыкамі.

Членства гэтых краін у еўрапейскім валютным саюзе з'яўляецца заканамерным вынікам аднаго з паловай дзесяцігоддзя рынкавай трансфармацыі з эканамічным вектарам на Еўрапейскі Саюз. У выніку рэформаў новыя краіны-члены дасягнулі, на думку большасці экспертаў, дастаткова высокага ўзроўня рэальнай і намінальнай канвергенцыі са старэйшымі членамі ЕС. Гэта дае падставу гаварыць аб тым, што яны хутчэй за ўсё атрымаюць выйгрыш ад увядзення еўра на сваёй тэрыторыі [3, с. 14–16].

Адна з найбольш высакаякасных падрабязных ацэнак пераваг і выдаткаў як у кароткатэрміновым, так і ў доўгатэрміновым перыядах ад увядзення еўра была праведзена ў Польшчы. Афіцыйная пазіцыя Польшчы была прадстаўлена ў 2004 г. Нацыянальным банкам краіны ў «Дакладзе аб выдатках і перавагах прыняцця Польшчай еўра» («A Report on the Costs and Benefits of Poland's Adoption of the Euro»).

Сярод магчымых выдаткаў ад уступлення ў зону еўра спецыялісты Нацыянальнага банку вылучаюць страту грашова-крэдытнай незалежнасці краіны, што можа прывесці да цяжкасцяў у супрацьстаянні такім наступствам асіметрычных шокаў як узрушэнні ВУП, занятасці, унутранага спажывання і г. д. Аднак, на думку экспертаў, верагоднасць асіметрычных шокаў у Польшчы пасля ўвядзення еўра невялікая, бо Польшча мае высокую гандлёвую інтэграцыю з краінамі зоны еўра (56,9% знешнегандлёвага абароту ў 2004 г.), умерана высокую карэляцыю бізнес-цыклаў і супаставімую з зонай еўра таварную структуру знешняга гандлю [4, с. 18–31].

Адным з важнейшых перадатачных механізмаў асіметрычных шокаў з'яўляецца знешні гандаль краіны. Знешні гандаль можа спрыяць асіметрычным уздзеянням на эканоміку, калі ў яго структуры пераважае прадукцыя з нізкай ступенню апрацоўкі. У гэтым выпадку экспарт краіны моцна залежыць ад замежнага попыту і стадыі бізнес-цыклу, на якой знаходзіцца краіна-партнёр. Як паказвае практыка, высокатэхналагічныя тавары ў меншай ступені залежаць ад замежнага попыту, а таму забяспечваюць стабільны рост экспарту. За апошняе дзесяцігоддзе структура знешняга гандлю Польшчы істотна змянілася. Значны рост як экспарту, так і імпарту адбыўся па артыкулу «машыны, абсталяванне і транспартныя сродкі». Доля гэтых тавараў у экспарце у 1995–2004 гг. павялічылася амаль у два разы. Гэту тэндэнцыю ў святле перспектыў увядзення еўра можна ахарактарызаваць як станоўчую,

бо ў гэтай таварнай секцыі канцэнтруецца высокатэхналагічная прадукцыя, якая карыстаецца стабільным міжнародным попытам. Гэта тэндэнцыя, якую эксперты часта звязваюць з інтэнсіўным прытокам у Польшчу прамых замежных інвестыцый, спрыяе павелічэнню супаставімасці структур знешняга гандлю Польшчы і зоны еўра [5, с. 373–374].

Не меншае значэнне пры аналізе перспектыў членства Польшчы ў зоне еўра мае аналіз выйгрышу краіны ад валютнага аб'яднання. Да кароткатэрміновых станоўчых вынікаў адносяць разавы эфект ад знікнення трансакцыйных выдаткаў, у той час як да доўгатэрміновых – рост прадукцыйнасці працы, дадатковы прыток інвестыцый, эфект стварэння гандлю і, як вынік, паскарэнне эканамічнага росту.

На дасягненне вышэйпрыведзеных вынікаў могуць паўплываць такія фактары, як памяншэнне рызыковасці польскай эканомікі і, як вынік, зніжэнне прэміі за рызыку і звязанае з гэтым падзенне доўгатэрміновых працэнтных ставак у цэлым на 1,5–2 працэнтных пункты, зніжэнне кошту капіталу па прычыне верагоднага павышэння суверэннага крэдытнага рэйтынгу Польшчы, павышэнне даверу інвестараў у беззваротны характар агульнай макраэканамічнай стабільнасці ў краіне, павышэнне прадказальнасці даходу ад экспартна-імпартных аперацый у выніку ліквідацыі рызыкі нечаканага змянення валютнага курсу і інш.

Эфекты росту знешняга гандлю Польшчы шматлікія. Сярод іх вылучаюць не толькі традыцыйны рост спецыялізацыі і магчымасць выкарыстання эфекту маштабу, але і прыток новых тэхналогій і назапашванне ведаў, аб чым сведчыць новая тэорыя гандлю. Прычым пры прыцягненні тэхналогій і ведаў асаблівае значэнне мае тое, што Польшча ўступае ў валютны саюз з краінамі, якія значна пераўзыходзяць яе па ўзроўню прымяняемых тэхналогій. Таму яна мае шанс з мінімальнымі выдаткамі хутка пераступіць на больш высокую траекторыю эканамічнага росту, што немагчыма зрабіць самастойна.

Трэба ўлічваць, што з цягам рэформаў і далейшай інтэграцыі бізнес-цыклы Польшчы будуць усё больш выраўноўвацца з еўрапейскімі, а таму з цягам часу верагоднасць асіметрычных шокаў будзе зніжацца, а выйгрыш ад валютнай інтэграцыі ўзрастаць.

#### 4. Перадумовы і перспектывы ўдзелу Беларусі ў працэсах валютнай інтэграцыі

Вопыт некаторых эканамічных аб'яднанняў і, перш за ўсё, Еўрапейскага Саюза, паказаў, што ўвядзенне адзінай валюты не пазбаўляе краін іх палітычнага суверэнітэту і ў той жа час можа з'яўляцца значным стымулам для доўгатэрміновага эканамічнага росту. Мэтазгодна паставіць пытанне аб перадумовах і перспектывах удзелу нашай краіны ў працэсах міжнароднай валютнай інтэграцыі. Што больш выгадна для Беларусі: захаваць уласную валюту, курс якой мог бы вольна змяняцца адносна грашовых адзінак трэціх краін, ці ўступіць у валютны саюз з адным з гандлёвых партнёраў?

Перадумовы міжнароднай валютнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у значнай ступені вызначаюцца высокай знешнегандлёвай адкрытасцю эканомікі (экспартная квота ў 2004 г. склала 60,1 %). У той жа час гэта характарыстыка недастаткова поўная, бо міжнародны гандаль не адзіная форма міжнародных эканамічных адносінаў. Важнай характарыстыкай адкрытасці эканомікі з'яўляецца ўдзел у міжнародным руху капіталу і, у прыватнасці, прыцягненне прамых замежных інвестыцый, якія ў пераходных эканоміках часта ўяўляюць сабой галоўны канал перадачы сучасных тэхналогій і кіраўнічага вопыту. Па стану на 2004 г. наша краіна больш як у два разы адстае ад сярэдняга паказчыку СНД па долі назапашаных прамых замежных інвестыцый у ВУП (9,0 % у Беларусі супраць 16,9 % у Расіі і 20,2 % у сярэднім па СНД) [6, с. 323–324]. Такім чынам, удзел рэспублікі ў міжнародным руху капіталу застаецца абмежаваным і, як вынік, абмежаванымі застаюцца і перавагі, якія краіна можа атрымаць ад удзелу ў міжнароднай валютнай інтэграцыі.

Такім чынам, Рэспубліка Беларусь мае істотныя перадумовы і вялікі патэнцыял удзелу ў працэсах міжнароднай валютнай інтэграцыі, бо валодае малой эканомікай са значным знешнегандлёвым сектарам. Разам з далейшым пашырэннем удзелу ў міжнародных эканамічных адносінах, Беларусі, як і любой іншай малой эканоміке, ва ўмовах глабалізацыі і росту ўзаемазалежнасці краін свету будзе выгадна пазбавіцца ад уласнай валюты на карысць адной з рэгіянальных грашовых адзінак.

Адзіным накірункам уключэння Беларусі ў працэсы валютнай інтэграцыі на сённяшні дзень з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Ключавой перадумовай валютнай інтэграцыі з Расіяй з'яўляецца тое, што яна наш галоўны знешнегандлёвы партнёр. Доля Расіі ў тавараабароце Рэспублікі Беларусь складае амаль 60 % і ў два разы (а па імпарту нават у тры разы) перавышае долю другога гандлёвага партнёра – Еўрапейскага Саюза [7, с. 56,68]. Значная гандлёвая інтэграцыя Беларусі і Расіі – станоўчы фактар для валютнай інтэграцыі, паколькі ён можа забяспечыць зніжэнне верагоднасці асіметрычных шокаў.

У той жа час было б памылковым сцвярджаць, што высокая гандлёвая інтэграцыя здольна сама па сабе забяспечыць выйгрыш нашай краіны ад валютнага аб'яднання. Пры аналізе выдаткаў і пераваг саюза для Беларусі трэба ўлічваць такія фактары, як структурныя адрозненні краін, асіметрычнасць ствараемага валютнага саюза, а таксама пераходны характар расійскай эканомікі.

Структурныя адрозненні нашых краін праяўляюцца перш за ўсё ў тым, што эканоміка Беларусі з'яўляецца значна менш рэфарміраванай, чым эканоміка краіны-суседа. Розная ступень рэфарміраванасці эканомік нашых краін прыводзіць да росту верагоднасці асіметрычных шокаў. Гэта тлумачыцца тым, што дамінуючы ў Расіі прыватны сектар хутчэй і больш эфектыўна прыстасоўваецца да зменных знешніх умоў, чым дамінуючы ў Беларусі дзяржаўны сектар. Таму крызісныя сітуацыі могуць суправаджацца рознай рэакцыяй эканомік і рознай працягласцю прыстасавання. У сувязі з гэтым адмаўленне ад ключавых інструментаў рэгулявання, якімі з'яўляюцца грашова-крэдытная і валютная палітыка, можа прывесці да больш высокай няўстойлівасці і ўразлівасці беларускай эканомікі.

Структурныя адрозненні беларускай і расійскай эканомік таксама праяўляюцца ў адрозненнях таварных структур знешняга гандлю. Структура знешняга гандлю Расіі характарызуецца дамініраваннем мінеральных прадуктаў, у той час як ключавымі галінамі эканомікі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца перапрацоўчыя галіны, у прыватнасці тыя, што вырабляюць машыны, абсталяванне, механізмы і транспартныя сродкі (27,5 % экспарту ў 2004 г.). Гэта сведчыць аб нізкай сінхранізацыі бізнес-цыклаў Беларусі і Расіі і патрабуе правядзення валютнай палітыкі, якая адрозніваецца ад расійскай.

Прыведзеныя структурныя адрозненні эканомік Беларусі і Расіі асабліва важныя, калі ўлічыць асіметрычны характар ствараемага валютнага саюза. У гэтым аб'яднанні патрэбы беларускай эканомікі пры правядзенні адзінай грашова-крэдытнай і валютнай палітыкі не будуць прымацца да ўвагі па аб'ектыўнай прычыне адрознення памераў і патэнцыялу краін-членаў. Такім чынам, асіметрычнасць валютнага саюза рэзка павышае і так высокую пагрозу росту нестабільнасці і павышэння ўразлівасці нашай эканомікі.

Механізмаў, якія б маглі іх згладзіць, практычна не існуе. Перш за ўсё трэба адзначыць, што значная колькасць цэнаў у Рэспубліцы Беларусь адміністрацыйна рэгулююецца, як і заработная плата, што пазбаўляе нас самага эфектыўнага сродку зглажвання асіметрычных шокаў. Што датычыцца міждзяржаўнай міграцыі, то яе цяжка лічыць дзейсным сродкам абсарбацыі асіметрычных уздзеянняў. Фіскальны федэралізм у Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі таксама не развіты.

Важным аспектам, які можа паўплываць на баланс пераваг і выдаткаў эканомікі Беларусі ў выніку валютнага саюза, з'яўляецца пераходны характар расійскай эканомікі. Як паказвае вопыт Польшчы, увядзенне еўра будзе спрыяць паскоранаму пераходу на больш высокую траекторыю эканамічнага росту. Эксперты адзначаюць, што гэты пераход можа адбыцца дзякуючы таму, што іх партнёрамі па валютным саюзе будуць прамыслова развітыя краіны, з якіх яны, дзякуючы валютнаму аб'яднанню, змогуць імпарціраваць высокую макраэканамічную стабільнасць, больш новых тэхналогій і прамых замежных інвестыцый.

Аднак такія эфекты немагчымыя ў той жа ступені пры валютнай інтэграцыі Беларусі з Расіяй. Па-першае, расійскі рубель не з'яўляецца сусветнай валютай і мала выкарыстоўваецца ў міжнародным гандлёвым абароце. Па-другое, працэс макраэканамічнай стабілізацыі ў Беларусі ў сувязі з валютнай інтэграцыяй аб'ектыўна абмежаваны ўзроўнем макраэканамічнай нестабільнасці ў Расіі. У-трэціх, наша краіна не можа разлічваць на значны прыток інвестыцый з Расіі па прычыне таго, што Расія сама востра адчувае патрэбу ў прамых замежных інвестыцыях на сённяшнім этапе свайго развіцця. У-пятых, тэхналагічны ўзровень эканомік Беларусі і Расіі супаставімы, а таму пераход на новую больш высокую траекторыю эканамічнага росту на аснове мадэрнізацыі эканомікі значна ўскладняецца.

Прыведзеныя высновы, якія вынікаюць з пераходнага характару расійскай эканомікі, сведчаць аб высокіх альтэрнатыўных выдатках Беларусі ад валютнай інтэгацыі з Расіяй. Гэтыя выдаткі тлумачацца стратамі ад невыкарыстання пераваг ад інтэграцыі з другім не менш значным для беларускай эканомікі рэгіёнам – Еўрапейскім Саюзам, ад якога мы маглі б атрымаць макраэканамічную стабільнасць, прыток прамых замежных інвестыцый і тэхналогій зусім іншай якасці, чым з Расіі.

### 5. Заключэнне

Працэсы міжнароднай валютнай інтэграцыі становяцца часткай глабалізацыі і інтэрнацыяналізацыі гаспадарчага жыцця. У гэтыя працэсы ўключаецца і частка краін з пераходнай эканомікай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Прыклад Польшчы паказвае, што выгады ад валютнай інтэграцыі могуць значна пераўзыйсці выдаткі. Гэта звязана з тым, што пераходныя эканомікі, якія далучаюцца да развітых, маюць магчымасць значна паскорыць свой эканамічны рост на аснове такіх доўгатэрміновых эфектаў, як рост узаемнага гандлю, дадатковы прыток прамых замежных інвестыцый і

новых тэхналогій, назапашванне кіраўнічых ведаў, паляпшэнне доступу прадпрыемстваў да пазыклівых сродкаў і інш.

Рэспубліка Беларусь таксама не з'яўляецца выключэннем з працэсаў міжнароднай валютнай інтэграцыі. У прыватнасці, наша краіна мае магчымасць утварыць валютны Саюз з Расійскай Федэрацыяй, сваім галоўным знешнегандлёвым партнёрам. У той жа час аналіз структурных адрозненняў эканомік Беларусі і Расіі не дазваляе гаварыць аб магчымасці атрымання істотнага выйгрышу ў выніку гэтага валютнага аб'яднання. Удзелу Рэспублікі Беларусь у працэсах міжнароднай валютнай інтэграцыі павінна папярэднічаць структурнае рэфарміраванне беларускай эканомікі, што дазволіць атрымаць дадатковы доўгатэрміновы эканамічны рост ад валютнай інтэграцыі з асноўным знешнегандлёвым партнёрам.

**Літаратура**


1. *Paul De Grauwe* Economics of Monetary Union: fifth edition. Great Britain: Oxford University Press, 2004. 258 p.
2. *Роберт А. Манделл* Теория оптимальных валютных зон // Евро - дитя Манделла? Теория оптимальных валютных зон: Сборник статей: Пер. с англ. М.: «Дело», 2002. С. 62–76.
3. Convergence Report 2004 / European Central Bank. 2004. 246 p. http://www.ecb.int/pub/convergence/html/index.en.html
4. A Report on the Costs and Benefits of Poland's Adoption of the Euro / National Bank of Poland. Warsaw: 2004. 126 p. http://www.nbp.pl/
5. Concise Statistical Yearbook of Poland 2005 / Central Statistical Office. Warsaw: 2005. 649 p. http://www.stat.gov.pl/english/opracowania_zbiorcze/maly_rocznik_stat/2005/
6. World Investment Report 2005: Transnational Corporations and the Internationalization of R&D / United Nations Conference on Trade and Development. 2005. 332 p. http://www.unctad.org/Templates/WebFlyer.asp?intItemID=3489&lang=1
7. Внешняя торговля Республики Беларусь за 2004 г. (предварительные данные) / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. Мн.: 2005. 165 с.


© ПГУ

# КОНКУРЕНТОСПОСОБНОСТЬ ПРЕДПРИЯТИЯ И ПУТИ ЕЕ ПОВЫШЕНИЯ (НА ПРИМЕРЕ ХЛЕБОЗАВОДА г. НОВОПОЛОЦКА, ФИЛИАЛ РУПП «ВИТЕБСКХЛЕБПРОМ»)

***Н. А. ВОЛКОВА,* Н. Л. БЕЛОРУСОВА**

The article reflects a practical research on the main aspects of the competitiveness of a firm. The purpose of the work is to discover the weakest points of an enterprise in order to find the ways to improve them and to ensure the leading position of a firm in the market

Ключевые слова: конкурентоспособность предприятия, конкурентоспособность продукции, конкурентные стратегии

Проблема конкурентоспособности предприятия носит в современном мире универсальный характер. Конкурентоспособность предприятия представляет собой относительную обобщенную характеристику, отражающую отличия процесса развития данного товара производителя и конкурента как по степени удовлетворения своими товарами конкретной общественной потребности, так и по эффективности производственной деятельности [1, с. 36].

Конкурентоспособность предприятия в основном характеризуется двумя группами показателей. К первой группе относят характеристики товара, формируемые производством, в том числе потребительские характеристики – качество, техническое обслуживание, дизайн и т.д., – определяющие конкурентоспособность товара. Во вторую группу входят экономические и технические характеристики условий создания, производства и сбыта товаров, характеризующие ценовую конкурентоспособность товара и конкурентоспособность предприятия-производителя в целом [2, с. 441].

В то же время, в условиях рыночной экономики для достижения конкурентоспособности предприятия особое внимание необходимо уделять конкурентным стратегиям, правильный выбор которых обеспечивает максимально прибыльное функционирование и устойчивое положение предприятия на рынке [3, с. 74].

В работе в качестве анализируемой единицы был выбран хлебозавод г. Новополоцка. В целях определения уровня конкурентоспособности завода была проведена оценка конкурентоспособности производимой продукции и следующих параметров деятельности предприятия: уровень эффективности хозяйствования, инновационная деятельность, организация сбыта, поддержка и содействие деятельности предприятия национальными и региональными органами, имидж предприятия. В то же время проведен сравнительный анализ показателей и характеристик хлебозавода г. Новополоцка с его основными конкурентами.

В результате анализа Новополоцкий хлебозавод был отнесен к предприятиям со средним уровнем конкурентоспособности. Исходя из сложившихся проблем, а так же с учетом конкурентной стратегии